Таким образом, М. О. Коялович и А. С. Будилович наличие в российском обществе революционных идей приписывали последствиям распространения западноевропейских ценностей (индивидуализма, свободы личности и др.), укоренение которых началось, как считали мыслители, со времени реформ Петра I. По вопросу причин войн и революций в Западной Европе М. О. Коялович разделял мнение славянофилов, в частности К. С. Аксакова, о господстве насильственного начала в государственном устройстве западных народов. Идеологи умеренного консерватизма указывали на необходимость критического, индивидуального подхода для каждой страны в вопросе реализации общедемократических свобод — совести, личности, собраний и союзов, печати и т. п.

**Библиографический список**

1. Бондаренко, К. М. Общероссийские правомонархические партии на территории Беларуси (1907 — февраль 1917 гг.): дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / К. М. Бондаренко. — Минск, 2015. — 421 л.

2. Будилович А. С. Славянское единство / Сост., предисл. и примеч. Ю. В. Климакова / Отв. ред. О. А. Платонов. — М.: Институт русской цивилизации, 2014. — 784 с.

3. Коялович, М. О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям / М. О. Коялович. — Минск: Лучи Софии, 1997. — 688 с.

4. Обзор деятельности Русского Окраинного Общества за 1908 г. (Первый год существования). — СПб.: Типография Императорской Академии Наук, 1909. — 54 с.

**Кахновіч Віктар Адамавіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

## 1917 ГОД У АДЛЮСТРАВАННІ КРЫНІЦ ЛАКАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ: ПРЫКЛАД ДАБРАСЛАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ ПІНСКАГА ПАВЕТА

У Беларусі і за мяжой у апошні час заўважна ўзрос інтарэс да падзей Першай сусветнай вайны і пасляваеннага жыцця Беларусі. Без сумніву, гэта звязана з лёсавырашальным значэннем тых падзей для будучыні не толькі Беларусі, але нават і усяго свету. Тое і падзеі Карнілаўскага мецяжа, і барацьба за стаўку галоўнакамандуючага расійскай арміяй у Магілёве, і ваенныя аперацыі часоў вайны, і значэнне Заходняга фронту для будучыні расійскіх рэвалюцый 1917 г., і вага мірных перамоваў у Брэсце, і т. д. Між тым, на наш погляд, вельмі важна і тое, што сваю актуальную распрацоўку набываюць сёння падзеі лакальнай гісторыі. Так, у 2014 г. выйшлі працы В. Ц. Дземянчыка аб жыцці сяла Выганашчы і ваколіц у часы Першай сусветнай вайны і рэвалюцыйнага 1917 г., а ў 2015 г. А. М. Вабішчэвіч выдаў артыкул аб Брэсце і Брэсцкай крэпасці ў той жа час [1; 2]. Між тым, у айчыннай гістарыяграфіі, зрэшты і ў сусветнай, бракуе разгляду лёсу асобных вясковых мясцовасцей у падзеях таго часу. Апошняе, на наш погляд, даволіла б якасна паглыбіць сістэму ведаў айчыннай і сусветнай гістарыяграфіі аб Беларусі і развіць канструкты т.зв. «генеральнай гісторыі».

Заўважым, што пэўным і надвычым цікавым выключэннем у беларускай гістарыяграфіі ёсць згаданая вышэй праца В. Ц. Дзяменчыка, якая на падставе апублікаваных і архіўных крыніц, а таксама на падставе апрацаванняў паведамленняў мясцовых жыхароў у рэчышчы вуснай гісторыі — распавяе аб жыцці людзей за часы вайны 1914—1918 гг. у раёне Агінскага канала, а асабліва — аб вёсках Выганашчы і Бабровічы. Гэта мясцовасць на паўночным-захадзе тагачаснага Пінскага павета Мінскай губерні. Фактычна расповяд ідзе аб адным з найбольш глухіх мікрарэгіёнаў Пінскага Палесся. У сваю чаргу з усходу да гэтага краю прымыкала Дабраслаўская воласць Пінскага павета (сучасны Бобрыкаўскі сельскі савет Пінскага раёна), што ахоплівала вытокі рэк Бобры і Вісліца. Мясцовасць аддаленая ад асноўных шляхоў зносін, змяшчаецца на водападзеле рачных сістэм Нёмана (Балтыкі) і Прыпяці / Дняпра (Чарнаморскі басейн) і, відаць, з'яўляецца летапісным Палессем на поўдзень ад Клецка і Слоніма, 1-я згадка аб якім адносіцца да 1270-х гг.

Заўважым, што для нас асноўным поглядам на гістарычны ход падзей таго часу з'яўляецца такі, што рэвалюцыйны 1917 г. і наступныя гады сталі вынікам шырокага кола праблем і глыбокіх супярэчанняў, што ў першую чаргу было звязанае з праблемамі сялянства. Апошняе складала на пачатку XX ст. да 85% насельніцтва і было пераважным сярод народаў шматмоўнага «Вавілону Расійскай імперыі». Прычым ступень мадэрнізаванасці сялянства, нягледзячы на спробы гэтай архаічнай па сваёй сутнасці імперыі, заставалася вельмі нізкай. Так, адукаванасць сярод сялянства складала, у т. л. у Беларусі, блізу 14—25% [13, с. 15, 75]. Як вынік, сялянства ў масе сваёй трымалася яшчэ традыцыйнай парадыгмы светабачання і спачатку прымала сусветную вайну як належнае, ці хутчэй непазбежнае зло, але затым пад градам цяжкасцей і бед адкрылася пераўсведамленню падзей і рэвалюцыйным чаканням [13, с.261—264]. Між тым, цікава якія магчымасці для вывучэння падзей таго часу і якія папярэднія вынікі датычна працэсаў таго часу даюць крыніцы па лакальнай гісторыі з яко-кольвечы палескай вясковай глушы. Увагу тут прыцягвае непасрэдна прылеглая да прадстаўленнай у працы Дземянчыка Выганашчанскага краю Дабраслаўская воласць. Па-першае, ёсць магчымасць параўнаць становішча і працэсы ў суседніх мясцовасцях; па-другое, у адрозненні ад Выганашчаў і ваколіц, дзе непасрэдна пралягала лінія фронту і таму назіралася значнае прыйсце немясцовага насельніцтва (салдаты, афіцэры і абслуга франтоў), то ў Дабраслаўскай воласці таго не павінна было быць, і цікава, як перажывала вайну і рэвалюцыю мясцовасць па-за-межамі прамога ўздзеяння фронту.

Паводле спісу населеных месц Мінскай губерні на 1878 г. Дабраслаўская воласць налічвала 7 вясковых грамад, 15 вёсак і 935 душ жыхароў [3, арк. 97—97 адв.]. Цэнтрам воласці было сяло Дабраслаўка са 129 душ жыхароў, яшчэ адным сялом была Малая Плотніца з 66 чал. Да Малой Плотніцы прымыкалі вескі Задуб'е (58 чал.), Канатоп (6 чал.), трохі далей на поўдзень — Чамля (30 чал.), Церабень (78 чал.), на паўднёвы захад — Бобрык (60 чал.). Далей ішлі вёскі Пласкінь (66 чал.) і Ліпнікі (23 чал.), а таксама ўласна сяло Дабраслаўка і прылеглыя да таго вёскі Пучын (48 чал.) і Лышча. Адносіліся да гэтай воласці тады вёскі Сташаны і Чухава, што аднак належалі да царкоўнага прыходу

с. Новы Двор, былі досыць аддаленымі, і як бачна з архіўных крыніц, у значнай ступені не ўдзельнічалі ў жыцці воласці.

*Табліца 1 — Рух насельніцтва воласці па метрычных запісах [4—8, 10—12]*

| **Катэгорыя / год** | **1864** | **1891** | **1901** | **1913** | **1914** | **1915** | **1916** | **1917** | **Дынаміка ў% 1917 г. да 1913 г.** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Нарадзілася (чал.) | 107 | 182 | 251 | 231 | 239 | 185 | 124 | 161 | -33% |
| Шлюбаў (лік) | 27 | 27 | 43 | 58 | 39 | 3 | 4 | 48 | -79% |
| Памерла (чал.) | 29 | 113 | 139 | 126 | 147 | 78 | 132 | 94 | -11% |

Як можна пабачыць з табл. 1 узыходзячыя трэнды нараджальнасці, ліку шлюбаў і смяротнасці зазналі ў часы Першай сусветнай вайны істотныя змены. Па-першае, з-за вайны людзі амаль перапынілі заключаць шлюбы, а нараджальнасць у сярэднім панізілася на 1/3. Па-другое, назіралася пэўнае зніжэнне смяротнасці (прыкладна на 1/10 у сярэднім), што дзіўна. Вытлумачэнне такая сітуацыя знаходзіць у агульным скарачэнні нараджальнасці, што адпаведна зніжалала і агульную смяротнасць, тады як звыш 50% памерлых складалі дзеці ва ўзросце да 5 год. Так, у 1890 г. па прыходу царквы Малая Плотніца з 65 памерлых было дзяцей да 1 года 21 чал., а ва ўзросце 1—5 год — 22, альбо разам ва ўзросце да 5 год — 33 чал. ці 51% ад усіх памерлых [9, арк. 343]. У 1912 г. з 53 памерлых па тым жа прыходзе дзеці да 5 год складалі 22 чал. ці 43%, але калі рахаваць дзяцей да 15 год, то яны складалі ў той нетыпова «лагодны» па смертнасці дзяцей год, — 30 чал. ці 59% усіх памерлых [10, арк. 53а адв. — 53б]. Агульна, сітуацыя калі звыш 50% памерлых складалі дзеці да 5 год і да 75—80% дзеці да 15 год — была тыповая аж да 1920-х гг. Болей таго, у часы вайны смяротнасць сярод дзяцей вырасла. Так, у 1916 г. ці 1917 г. па даных згаданага вышэй прыходу сярод памерлых дзяцей да 5 год было звыш 60%. Між тым, заўважна больш як звычайна, у 1916 г. памірала дзяцей ад воспы, а ў 1917 г. — ад чахоткі [1 арк. 127 адв. — 137, 171 адв. — 177]. Агульна, у тыя часы, напрыклад датычна 1916 г., па запісах святара царквы с. Малая Плотніца Грыгорыя Жукава (служыў у прыходзе з лістапада 1913 г. і, відаць па ўсім, быў маладым новапастаўленым святаром [12, арк. 20]) дзеці шмат паміралі «ад воспы», «ад чахоткі», «ад праступы», «ад тыфу» [12, арк. 127 адв. — 137]. Болей таго, «ад калтуна», ад якога ў воласці не было памерлых з 1870-х гг., загінула ў чэрвені 1916 г. 7-гадовая Агаф'я, дачка сялянкі-ўдавы Настассі Апанасавай Стасюкевіч з с. Малая Плотніца [12, арк. 132 адв. — 133].

Дададзім, што ўразлівыя да хвароб і смертнасці катэгорыя, такія як народжаныя па-за шлюбам («незаконанароджаныя») малюкі, дзеці і самі ўдовы, — сталі ва ўмовах вайны яшчэ больш частай ахвярай хвароб і цяжкіх сацыяльных умоў. Так, у тым жа Малаплотніцкім прыходзе ў 1917 г. усе 3 пазашлюбных дзяцей памерлі ад хвароб ва ўзросце да 1 года [12, арк. 158 адв. — 169 адв.]. Разам з тым, асабліва на прыкладзе суседняга Дабраслаўскага прыходу бачым заўважны рост нараджэння пазашлюбных дзяцей за гады вайны: калі раней тое звычайна ў пачатку ХХ ст. 1—2 выпадкі на прыход у год, то ва ўмовах вайны — да 5 выпадкаў у год [11]. Пэўная прычына такой сітуацыя бачыцца,

па-першае, у адтоку мясцовых мужчын, асабліва маладых, у войска, а другое — у заўважным прытоку немясцовых, расійскіх салдат. Так, з пачатку 1916 г. бычым сітуацыю, калі немясцовыя (данскі казак Іван Мешчаракоў, казакі 4-га і 5-га ўсходнесібірскіх палкоў Іван Макараў, Іван Дакучаеў, Фёдар Сцяпанаў, радавы сапёр Мікалай Цімохін, інш.) [12, арк. 109, 118, 126] фігуруць як хросныя ў народжаных мясцовымі сялянкамі дзяцей. Альбо, менавіта з сакавіка 1917 г. назіраем, пасля амаль спынення шлюбаў у часы вайны, шэраг вяселляў тутэйшых сялянак з нетутэйшымі салдатамі [11].

Між тым, сітуацыя з ростам шлюбнай актыўнасці ў 1917 г. вельмі добра фіксуе прыход па-рэвалюцыйнай свабоды ў тагачасную вёску. Заўважна і такая адзнака часу, як змены ў тэрміналогіі метрычных кніг: калі раней звычайнымі былі саслоўныя вызначэнні асоб: «селянін» ці «сялянка», «мешчанін» ці «мяшчанка» той ці іншай вёскі (сяла, ваколіцы), і выключэнне давалася толькі розным «адстаўным салдатам (радавым, т. п.)», «адстаўным рэкрутам», то ў новых абставінах, на прыкладзе таго ж Г. Жукава, — скрозь з'яўляюцца з сакавіка 1917 г. вызначэнні тыпу: «грамадзянін» ці «грамадзянка» пэўнай вёскі, за выключэннем катэгорыі як «бежанец», што была свайго роду адзнакай вайны звычайнай ужо з 1915 г. [12, арк. 142—159].

Такім чынам, выяўляецца, што нягледзячы на тое, што Дабраслаўская воласць была з ліпеня 1915 г. прыфрантавой зонай (напрыклад, уноч 14 ліпеня 1917 г. у вёсцы Задуб'е была забітая ці артылерыйскім выстралам ці з бомбай з аэраплану сям'я Філіпа Савінава Навумчыка з 5 чал. [12, арк. 173 адв. — 174]) — у краі было немала бежанцаў. Так, ужо ў канцы 1914 г. у в. Церабень з'явіўся селянін вёскі Падвысоцье Ровенскага павета Валынскай губ. Сямён Іванавіч Юдко 29 год з дачкой Вольгай 4-х год [12, арк. 77, 87]. У звестках за жнівені 1915 г. сустракаем наяўнасць у с. Малая Плотніца і ваколічных вёсках сям'ей і паасобных бежанцаў — сям'я Івана Брухацкага з в. Навасёлкі Грубешоўскага пав. Холмскай губ., Антона Семенюка і Кацярыны Антанюк з с. Валоўцы Грубешоўскага пав., сям'я Каленіка і Пелагеі Каленікавых з Кобрыншчыны [12, арк. 89 адв. — 106] і немала інш. Між тым, бежанцы былі вельмі сацыяльна ўразлівымі. Напрыклад, маем звесткі, што ў чэрвені 1917 г. памерла ад чахоткі глуханямая 18-гадовая бежанка з с. Галоўчыцы Кобрынскага павета Марыя Антонаўна Тымчук [12, арк. 171 адв.]. Што трымала купу бежанцаў у глухіх вёсках паблізу фронта? Відаць, спадзяванне хутчэй вярнуцца ў свае родныя вёскі, што засталіся за лініяй фронту.

**Бібліяграфічны спіс**


1. Вабищевич А. Н. Бресткая крепость и город Брест в годы Первой мировой войны глазами очевидцев / А. Н. Вабищевич // Брестская крепость: историко-культурный контекст: сб. мат–в Междунар. форума препод. русск. языка и лит–ры стран СНГ и Европы, 6—10 октября 2014 г., Брест / под общ. ред. Т. В. Сенькевич. — Брест, 2015. — С. 12—21.
2. Демянчик В. Т. Выгонищи в Великой войне / В. Т. Демянчик. — Брест: Альтернатива, 2014. — 200 с., [84] л. ил.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Фонд 16619. — Воп. 1. — Спр. 1.
4. НГАБ. Фонд 136. — Воп. 17. — Спр. 54.
5. НГАБ. Фонд 136. — Воп. 17. — Спр. 79.
6. НГАБ. Фонд 136. — Воп. 25. — Спр. 96.

7. НГАБ. Фонд 136. — Воп. 25. — Спр. 98.
8. НГАБ. Фонд 136. — Воп. 25. — Спр. 285.
9. НГАБ. Фонд 136. — Воп. 25. — Спр. 286.
10. НГАБ. Фонд 136. — Воп. 25. — Спр. 289.
11. НГАБ. Фонд 136. — Воп. 37. — Спр. 105.
12. НГАБ. Фонд 136. — Воп. 37. — Спр. 148.
13. Поршнева О. С. Крестьяне, рабочие и солдаты России накануне и в годы Первой мировой войны / О. С. Поршнева. — М.: РОССПЭН, 2004. — 368 с.

**Корень Елена Васильевна**

*Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины (Гомель, Беларусь)*

## ДЕКАБРИЗМ В РЕФЛЕКСИИ ИНТЕЛЛИГЕНЦИИ ПЕРВОЙ ЧЕТВЕРТИ XX В. ОБ ИСТОКАХ РУССКОЙ РЕВОЛЮЦИОННОСТИ

Интеллигенция революционной эпохи усиленно размышляла об истоках революционных настроений в России. Политическое наследие декабристов было одним из предметов этой рефлексии, его влияние на развитие русской общественно-политической мысли в самом широком спектре: от либеральных до самых радикальных течений.

К декабристам стремились возвести свои традиции влиятельные политические силы. После революции 1905 г. к делу декабристов обратились многие историки и публицисты. Одни искали истоки современных для них революционных движений. Другие стремились навязать декабристам программные и тактические формулы своего времени [1, с. 82—83]. Третьи обвиняли декабристов как зачинщиков революции. «Если генеральский суд времени Николая I осудил его [декабриста, — прим. Е.К.] однажды, то дважды и трижды могло осудить его память интеллигентское судилище времени Николая II», — заметил Г. В. Вернадский [2, с. 83].

В декабристах видели своих предшественников, как левые революционеры, так и умеренные либералы. Г. В. Плеханов прослеживал в развитии революционной мысли в России линию от декабристов к социал-демократам. Однако он заметил, что последним, в отличие от декабристов, удалось найти программу действий, обеспечивающую поддержку народных масс [3, с. 47—51]. В. И. Ленин считал себя в определенной степени наследником декабристов [4, с. 498, 500—502]. Секретарь IV Государственной думы кадет Д. И. Шаховской (внук декабриста Ф. П. Шаховского и П. Я. Чаадаева) также гордо заявлял, что он «внук декабриста» и всегда помнит об этом, из рассказов близких о декабристах он «почерпнул непоколебимую веру в правоту либерального дела в России» [5, с. 65].

Много звучало и восхвалений, и обвинений в адрес первых русских революционеров. З. Н. Гиппиус 14 декабря 1917 г., возмущенная тем, что происходило после Октябрьской революции, разочарованная в ожиданиях, размышляла о родоначальниках освободительного движения: «простят ли чистые герои? // Мы их завет не сберегли. // Мы потеряли все святое: // И стыд души, и честь земли». Саму же идею революции, как пишет поэтесса «Мы утопили,